# АБУДЗІЦЬ ЖЫВЫХ — ДА ЖЫЦЦЯ

**Баліць... Калі можна было б вызначыць адным словам галоўны матыў творчасці Васіля Быкава, то яно б характарызавала б моцнае пачуццё неабыякавага чалавека, які хацеў бы абудзіць іншых да жыцця. Абудзіць іншых — жывых — да жыцця, якое пачало сыходзіць у звыкласць, у будзённасць, у стабільнасць і прадвызначанасць, за якімі губляецца часта чалавек як асоба. Мы можам існаваць па завядзёнцы, думаць пра свае жаданні і планы. Ставіць іх вышэй за планы і жаданні іншых. Пакуль не надыдзе момант, калі мы разумеем: той, іншы, чужы чалавек мае каштоўнасць у маім жыцці, можа ўплываць на яго нават тады, калі мы не знаёмыя. І каштоўнасць майго жыцця вымяраецца каштоўнасцю яго жыцця. Бо ў нашым свеце кожны чалавек — частка адзінай сістэмы ЗЯМНОГА ЖЫВОГА, у якой страта асобнай часцінкі прыводзіць да парушэння балансу. І сістэма можа разбурацца, а гэта ўдарыць і па частках іншых. Так ці інакш.**

**У творах Быкава расповед ідзе заўсёды пра часткі, роля якіх вызначальная для Жыцця. Людзі як часцінкі жывога ў канкрэтных сітуацыях, самых экстрэмальных умовах, якія толькі могуць быць. Няма нічога больш жудаснага і вар'яцкага, калі людзі — істоты аднолькавыя па сутнасці эмоцый, адчуванняў, жаданняў — пачынаюць знішчаць сабе падобных. І знішчэнне становіцца прагай для некаторых. У той час тыя, хто з адваротнага боку выбіраюць: падпарадкоўвацца гэтай празе ці змагацца за сябе. І за тых сабе падобных, жыццё каго можа залежаць ад твайго выбару. Быкаў сам звёдаў гэты момант асабістага выбару, калі на фронце штодня назіраў моманты гераізму (калі выбар жыцця іншага быў вышэйшы за жаданне жыцця асабістага), і ён, пабываўшы ў тых умовах выбару, разумеў сутнасць слабасцяў клопату за сваё выжыванне. Менавіта выжыванне — бо калі ахвяруеш іншымі, жыццё можа быць толькі часовым: сёння, заўтра — і забылі. Ці захацелі забыць, выкрасліць імя той часцінкі, якая аказалася слабой. Гэта цуд Быкава як пісьменніка: ён пісаў пра вайну, але вывеў генеральную формулу чалавечых паводзін у любых сітуацыях, калі, кіруючыся маральным законам асобны чалавек становіцца АСОБАЙ. І тады часцінка вызначае існаванне народа, краіны і нават, можа быць, усёй чалавечай цывілізацыі. Яму балела. Ён здолеў данесці гэты боль, нараджаючы адказнасць. І таму — баліць. І сёння баліць, калі чалавек ізноў на мяжы выбару: жыць за сябе ці жыць дзеля іншых. Баліць... Гэтым вялікі наш пісьменнік з яго вечным болем. Такім адчувальным і зразумелым — на ўсе часы, пакуль ёсць чалавек, з усімі спакусамі, якія на яго звальваюцца. Вайна можа быць і нябачнай...**

**Сёння, у дзень народзінаў Васіля Уладзіміравіча, у дзень 90-гадовага юбілею пісьменніка, хочацца звярнуцца да яго як да асобы, дзеля таго, каб лепш разумець сябе.**

## «ПАЙСЦІ — І ВЯРНУЦЦА»

**Сяргей ПАНІЗНІК, паэт:**

— Уяўляючы Мацярык Васіля Быкава, я напісаў такія радкі: «О, выспа шчасця —Атлантыда: / каму амбон, каму — карыта... / Тарнада зможа тут прайсці. / Але атланта-беларуса / не змые хваля землятруса: / яго — назло! — ўтрымаць павінна / жывога слова пупавіна».



Васіль Быкаў. Гродна, Замкавая гара. Чэрвень 1969 г. Фота С. Панізніка.

Першы раз сустрэўся з Васілём Уладзіміравічам каля Каложы тым чэрвенем, калі жыхару Гродна споўнілася 45 гадоў. Напружаныя былі часіны для пісьменніка-франтавіка, які не ўтойваў ад чытача жорсткую праўду вайны. Перажываў, бо хмары часта завіслі над выпакутаванымі аповесцямі. Але ў маім першым вершы-прысвячэнні В. Быкаву нібыта яго вуснамі вымавіліся такія аптымістычныя радкі: «Чую, чую: у звыклай будні / трапяткое крыло... І верыцца: / не заснула ты, чуйнае сэрца, / да прылётнай абуднасці. / Пад завеяй не затыхнулася, / не знямела яшчэ — і можа / тою гулкаю быць Каложай, / што над Нёманам пахіснулася».

Васіль Быкаў, як ніхто іншы з нашых літаратараў, стаў самым гулкім на кантынентах планеты, куды разам з яго творамі «перакладалася» Беларусь і найменне таго народа, які, паводле разважанняў В. Быкава, мужна, балюча ўсё яшчэ ствараe ў сябе нацыю.

Дзяржаватворцам быў Быкаў у с в а е 45 гадоў. Такім ён застаецца і цяпер, у яго і ўжо ў н а ш а 90-годдзе, калі мы ў дзень юбілею згадваем і Героя (Літаратурнай!) Працы, і Народнага (а таксама — міжнароднага) пісьменніка.

Васіль Быкаў «дажыў да світання» сваёй высакароднай ідэі — Словам служыць Праўдзе. Цяпер яго «доўгую дарогу дадому» прадаўжаць нам — богакроплям у бласлаўлёным ім акіяне жыцця. Калісьці, нібыта ад імя Быкава, складаліся такія радкі з прысвечанага яму верша: «Мая світальная існота — /асоба гордая, жывая... / Яна для Госпада — гаспода / малітвенная, крыжавая». То няхай і сёння бадзёрыцца для новых узлётаў пранізлівая душа Васіля Уладзіміравіча. А светлая памяць пра атланта асмельвае нас на ўгаспадарлівасць яго айчыннага Мацерыка.

## «ХРЫБТОМ, СКУРАЙ ВАЙНУ АДЧУЎ»

**Міхась ТЫЧЫНА, літаратуразнаўца, пісьменнік, доктар філалагічных навук:**

— Кожны таленавіты чалавек важны для культуры краіны, а тым больш чалавек, у дачыненні да якога ўжо гучыць паняцце «геній» — абгрунтавана і невыпадкова, бо ўсё жыццё яго пацвярджае гэты яго грамадскі статус. На маю думку, Васіль Быкаў уяўляе сабой разгорнутую хартыю (ёсць такі вобраз у гістарычнай літаратуры, гэта тое, на чым пішуць нейкія значныя рэчы), якая напісана гісторыяй ХХ стагоддзя, і Васіль Быкаў у гэтай гісторыі заняў асобнае месца. Бо цяжка ўявіць без яго Рэспубліку Беларусь. Яна была б іншай без Быкава, калі б у ёй не было такога тонкага і выдатнага летапісца ваенных часоў і тых падзей, якія адбываліся на працягу ХХ стагоддзя. Гэта сведчанне і яго маштабу.

**— Калі вызначаць месца беларускай літаратуры ў сусветнай, то мы часта вельмі сціплыя, можа, таму што недастаткова ўсведамляем такую з'яву, як Быкаў, які не падобны ні на каго...**

— Калі гаварыць пра сусветны ўзровень, то трэба меркаваць па нейкіх дакладных звестках. Я, будучы ў Германіі гадоў 10 таму, заходзіў у кніжныя крамы і заўсёды цікавіўся, ці ёсць там кнігі Быкава. Калі трапляла энцыклапедыя, то хацелася зазірнуць, ці ёсць Быкаў. Вядома, напрыклад, што нашы класікі Янка Купала і Якуб Колас прысутнічаюць і ў брытанскай энцыклапедыі. Прынамсі, у нямецкай, на нямецкай мове я якраз бачыў імя Васіля Быкава і быў вельмі ўзрадаваны. Вядома, трэба лічыцца і з такімі фактамі, што яго творы выходзілі амаль на 50 самых вядомых мовах свету ў перакладзе. Я ведаю, што нават студэнты некаторых універсітэтаў у Амерыцы цікавяцца яго вядомай аповесцю «Мёртвым не баліць». Баліць жывым і баліць людзям, якія ў тым ліку за мяжой жывуць — у іх жа ёсць пачуцці. Я думаю, яны таксама шукаюць адказаў на жыццёвыя пытанні. Насамрэч цяжка вызначыць, колькі дакладна людзей прачыталі, асэнсавалі, адчулі думкі пісьменніка, нават у нас.

**— У творах Васіля Быкава — беларускае адчуванне вайны. Ці можна гаварыць пра адметнасць беларускай ваеннай прозы?**

— Гэтая адметнасць ідзе ад той адметнасці, якой была вайна на нашай тэрыторыі, бо раней такога свет не ведаў. А цяпер імкнецца ведаць. Таму і сведчанняў розных у нас багата. Узгадаць можна яшчэ дакументальную кнігу «Я з вогненнай вёскі». Вядома, тая вайна была не параўнальная з ніякімі папярэднімі войнамі. Быкаў гэта не проста ведаў, а хрыбтом, скурай вайну адчуў, нёс гэтыя веды да канца.

## «СТАЦЬ ЧАЛАВЕКАМ З ВЯЛІКАЙ ЛІТАРЫ»

**Сяргей МІНСКЕВІЧ, літаратар, кандыдат філалагічных навук, супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай Акадэміі Навук Беларусі:**

— Васіль Быкаў найперш цікавы тым, што ён пісаў праўду. Пісаў тое, што ён перажыў сам, таму ведаў і хацеў зрабіць псіхалагічны аналіз сваіх герояў: што яны перажылі, дзе мяжа чалавечнасці, а дзе — нечалавечнасці. Таму што ён пісаў пра вайну, дзе людзі былі ў нечалавечых умовах. Гэтыя ўмовы на іх звалiліся — ніхто сам такога не шукаў. І вось ён разважаў, як чалавек можа ці выжываць, ці загінуць у такіх умовах. Таму Быкаў — фактычна даследчык душы чалавека. І гэтым ён цікавы не толькі для Беларусі, а для ўсяго свету, бо выказаў у творах досвед, які меў сам. Досвед — як папярэджанне іншым, як глыбокае веданне таго, што можа адбывацца з чалавекам.

**— У савецкі час, калі было больш жывых сведкаў вайны, кнігі Быкава былі вельмі запатрабаваны. Сучаснае маладое пакаленне выхоўваецца ў іншых умовах. Але наколькі цікавыя яму такія кнігі?**

— Цяперашняй моладзі вельмі цяжка чытаць сур'ёзныя кнігі, таму што ў яе вельмі мала часу: цяпер з'явіўся інтэрнэт, усе хочуць чытаць тое, што выкладзена ў сацыяльных сетках сябрамі ці на сайтах. І нават калі шмат напісана ў посце, то гэта ўжо выклікае цяжкасці: маўляў, «шмат літар». Але ў жыцці нават такой шалёнай хуткасці заўсёды знойдуцца людзі, якія цікавяцца, якім трэба пазнанне — ад псіхалагічнага да гістарычнага. Таму што вайна — гэта гістарычная тэма. Для ўдумлівай моладзі сур'ёзная літаратура заўсёды цікавая. Ёсць такія даследаванні, што класічнай літаратурай цікавіцца 5-7 працэнтаў насельніцтва. Цікавасць ёсць, ёсць цікавасць да Быкава. Я лічу, што нашых аўтараў трэба папулярызаваць — рабіць канферэнцыі, фестывалі, тэматычныя ўрокі. Трэба паказваць людзям такую літаратуру, бо яна не толькі выхоўвае, але і дапамагае рабіць самааналіз. Калі чалавек час ад часу робіць самааналіз, то ён працуе над сабой, удасканальвае сваю душу, каб стаць Чалавекам з вялікай літары.

## «ЖЫВЫ, ЧУЛЫ, З ЦУДОЎНЫМ ПАЧУЦЦЁМ ГУМАРУ»

**Вольга ГУЛЕВА, загадчык навукова-экспазіцыйнага аддзела Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры:**

— Калі пачалі ствараць экспазіцыю «Музея-дачы Быкава» пісьменнікі хацелі захаваць мемарыяльнасць, каб у гэтым памяшканні адчуваўся дух Быкава. Вядома, можна было б зрабіць экспазіцыю, якая прадстаўляе яго як творцу, але калі пачалі працаваць разам з сям'ёй, з удавой Ірынай Міхайлаўнай над стварэннем музея, калі прыехалі на дачу, то зразумелі, што гэтае памяшканне — не вельмі вялікае — каштоўнае зусім іншым. Там захавалася атмасфера Быкава, яго рэчы, нягледзячы на тое, што яго даўно няма і на дачы яны ўжо некалькі гадоў не жылі, ёю карысталіся іншыя людзі, але вось тое, быкаўскае, у ёй засталося. Гэта сам будынак, ёсць нават нейкія аркушы з заўвагамі, дзе пазначана яго рукой, якім павінна быць гэтае памяшканне: што і дзе ў ім будзе знаходзіцца. Бо дачу яны будавалі, калі пісьменнік быў ужо не вельмі малады, яму было гадоў 60. Усё прадумвалася і стваралася адпаведна часу, нават аздоба вагонкай, якая тады была распаўсюджана, захавалася. Гэта дача для яго была спробай збегчы з горада, з бетону, тлуму, мітусні. А там бярозкі, маляўніча. Ён, вясковы хлопец, хацеў быць бліжэй да прыроды, каб было месца адпачыць душой. На дачы ёсць кабінецік, але ёсць успаміны і згадкі пра тое, што яму там не вельмі пісалася. Затое на дачу да яго прыязджалі сябры, пісьменнікі, іншыя творцы. Алесь Адамовіч бываў, Рыгор Барадулін, Генадзь Бураўкін. Яму прывозілі падарункі. Ёсць, напрыклад, карціна мастачкі Ніны Паплаўскай. Гэты музей, на нашу думку, акрамя самой асобы Быкава, дазваляе адчуць жыццё і атмасферу, у якой існавалі творцы таго часу.









Васіль Уладзіміравіч быў вельмі ўважлівы да сяброў. Пра гэта сведчыць, напрыклад, тое, як ён перадаваў прывітанне сям'і Барадуліна, і нават узгадваў ката. Гэта толькі на фотаздымках ён выглядае сур'ёзным. У жыцці гэта быў вельмі жывы чалавек, чулы, з цудоўным пачуццём гумару — гэта можна адчуць, у прыватнасці, па яго малюнках. Усе ведаюць, што Быкаў добра маляваў. І некаторыя малюнкі мы прадстаўляем, але менавіта тыя, якія кладуцца на нашу ідэю. Бо ён маляваў і гэтую дачу, і любімую машыну — быў заўзяты аўтааматар, добра разбіраўся і сам корпаўся ў аўто. Але ёсць і расклад руху аўтобусаў на Мінск на невялічкай паперцы — мы вырашылі яе пакінуць. Застаўся гадзіннік Быкава, на якім зафіксаваны яго час. У гэтым музеі наведвальнікі могуць зрабіць вандроўку ў яго час. Мы плануем, што гэта будзе сезонны музей, але ў нашай гісторыі ёсць даты, якія прыпадаюць на вясенне-летні перыяд (Дзень Перамогі, дзень пачатку вайны, Дзень вызвалення Беларусі), з якімі звязваецца імя Васіля Быкава, пісьменніка-франтавіка. І пра гэта дзякуючы яго асобе маглі б цяпер даведвацца школьнікі, малады людзі. І тыя, хто хоча яго зразумець не толькі па кнігах. Можа быць, дзякуючы таму, што літаратурнай экспазіцыі ў гэтым музеі не будзе, у большай ступені ў ім можна адчуць асобу Васіля Уладзіміравіча як чалавека.

**Матэрыялы паласы падрыхтавала Ларыса ЦІМОШЫК.**